# Універсальныя бібліяграфічныя дапаможнікі

*С. В. Зыгмантовіч*

Аўтарытэтнейшымі бібліяграфічнымі крыніцамі інфармацыі аб апублікаваных у Беларусі дакументах па ўсіх галінах ведаў з'яўляюцца крыніцы нацыянальнай бібліяграфіі. На працягу 2001–2005 гг. працягвалася работа Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі (НКП) па падрыхтоўцы і выданні крыніц бягучай і рэтраспектыўнай дзяржаўнай бібліяграфіі. Захавалася сістэма бягучых крыніц дзяржаўнай бібліяграфіі, прадстаўленая "Летапісам друку Беларусі" (3 (2001–2002 гг.), 4, 5, 6 (2003 г.), 2, 3, 4 (2004 г.), 5 (2005 г., ч. 1)) * (11 летапісаў) і двума штогоднікамі "Кнігі Беларусі" (2 (2001–2002 гг.), 3 (2003 г.), (4 (2005 г., ч. 1)) і "Паказальнік бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі" (1 (2001–2002 гг.), 2 (2003 г.), 1 (2004 г.), 1 (2005 г., ч. 1)).

На пачатак 2006 года "Летапіс друку Беларусі" прадстаўлен аб'яднаным выпускам, які ўключае сем дыферэнцыраваных па відах выданняў летапісаў, што выходзяць з рознай перыядычнасцю. Змены ў перыядычнасці выхада асобных дзяржаўных бібліяграфічных паказальнікаў звязаны са скарачэннем аб'ёмаў дакументных патокаў. Штомесяц друкуюцца два летапісы "Кніжны летапіс" і "Летапіс нарматыўна-тэхнічных дакументаў і выданняў вузкага прызначэння"; штоквартальна выходзяць "Летапіс аўтарэфератаў дысертацый", "Летапіс нотаў", "Летапіс выяўленчага мастацтва", "Летапіс рэцэнзій", якія адлюстроўваюцца ў 3, 6, 9, 12 нумарах "Летапісу друку Беларусі"; з 2001 года "Летапіс картаграфічных выданняў" прадстаўлен ў аб'яднаным выпуску штогадовым выданнем у 12 нумары. Самастойнымі выпускамі выдаюцца "Летапіс часопісных артыкулаў" (5, (2005 г., ч. 1)) (штомесячна), "Летапіс газетных артыкулаў" (5, (2005 г., ч. 1)) (штомесячна), "Летапіс перыядычных выданняў і выданняў, якія прадаўжаюцца" (4 (2001–2002 гг.), 7 (2003 г.), 5 (2004 г.), (6 (2005 г., ч. 1)) (штогодна).

З 2005 года ў самастойнае выданне выдзелены паказальнік "Беларусь у сусветным друку" (3 (2005 г., ч. 1)) са штоквартальнай перыядычнасцю. З 1992 па 2004 гг. гэты паказальнік выходзіў штомесячна і змяшчаўся ў аб'яднаным выпуску "Летапісу друку Беларусі". Трэба адзначыць, што ў гісторыі гэтага паказальніка ўжо быў перыяд, калі ён выходзіў як самастойнае выданне – з 1982 па 1991 гг. (наогул, пачатак яго выдання – 1946 г.). Лагічнасць сённяшняга рашэння відавочна. У адрозненні ад усіх астатніх відаў летапісаў, якія адлюстроўваюць розныя віды дакументаў па тэрытарыяльна-дзяржаўнай адзнацы, "Беларусь у сусветным друку" – нацыянальны бібліяграфічны паказальнік беларускай экстэрыёрыкі (беларусікі), прызначаны для інфармавання аб друкаваных выданнях і публікацыях пра Беларусь і беларусаў, на беларускай мове, беларускіх аўтараў, што апублікаваны ў друку замежных краін. Рыхтуецца ён на карпаратыўных пачатках сумеснымі намаганнямі Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі, рэспубліканскімі навуковымі бібліятэкамі і грамадскім аб'яднаннем "Міжнародная асацыяцыя беларусістаў". Гэта комплексны паказальнік, у якім адлюстроўваюцца ўсе віды выданняў. Матэрыял у паказальніку ўлічваецца за тры гады (бягучы і два мінулыя), а то і больш працяглы перыяд у сувязі са спазненнем паступлення інфармацыі аб дакументах, таму яго цяжка аднесці да бягучай бібліяграфічнай крыніцы, хутчэй па аналогіі з пастаянна папаўняючыміся базамі даных, гэта комплексны па функцыянальна-мэтавай прымеце паказальнік.

---

* *Лічбы, прыведзеныя ў круглых дужках, адпавядаюць нумару бібліяграфічнага запісу ў "Паказальніку бібліяграфічных дапаможнікаў" за азначаны год.*

Якія ж змены характэрны яшчэ для крыніц бягучай дзяржаўнай бібліяграфічнай інфармацыі за аналізуемы перыяд? Усе пералічаныя крыніцы аб'яднаны ў адно серыйнае выданне і выходзяць у серыі "Нацыянальная бібліяграфія Беларусі", што падкрэслівае іх статус, відавую прыналежнасць, агульную цэласнасць; з'явіліся контртытул і прадмова на замежнай (англійскай) мове, арыентаваныя на магчымасці выкарыстання гэтых базавых крыніц нашай дзяржавы карыстальнікамі замежных краін. Аналізуючы структуру і выдавецкае афармленне выданняў нацыянальнай бібліяграфіі, можна канстатаваць, што яны ўсё больш адпавядаюць міждзяржаўнаму стандарту "ГОСТ 7.61–96. Издания. Государственные (национальные) библиографические указатели. Общие требования". У метадычным плане трэба адзначыць, што ўсе бібліяграфічныя запісы ў паказальніках прадстаўлены ў адпаведнасці з новымі міждзяржаўнымі стандартамі "ГОСТ 7.1–2003. Библиографическое описание документа. Общие требования и правила составления", "ГОСТ 7.80–2000. Библиографическая запись. Заголовок. Общие требования и правила составления"; прадмова пачала друкавацца да кожнага выпуску "Летапісу друку Беларусі", а не толькі да першага, што значна аблягчае знаёмства з ім і яго выкарыстанне.

У прадмове да "Летапісу друку Беларусі" даецца спасылка на адрас электроннай версіі нацыянальнай бібліяграфіі краіны ў Інтэрнеце на сайце НКП (http://natbook.org.by). На сёння ў Электронным каталогу нацыянальнай бібліяграфіі прадстаўлена больш за 340 тысяч запісаў. Базы даных вядуцца па ўсіх відах дакументаў, якія з'яўляюцца аб'ектам бібліяграфавання ў друкаванай версіі. З'яўленне электроннага рэсурса нацыянальнай бібліяграфіі павышае не толькі камфортнасць яго выкарыстання ў пошуку неабходнай інфармацыі, але і вырашае праблему аператыўнасці адлюстравання друкаванай прадукцыі краіны.

Між тым, па-ранейшаму застаюцца для стваральнікаў крыніц дзяржаўнай бібліяграфіі тыя ж праблемы, што і пяць гадоў назад: паўната прадстаўлення інфармацыі аб усіх дакументах, якія выходзяць на тэрыторыі краіны, у тым ліку і недрукаваных матэрыялах; каардынацыя дзейнасці не толькі з бібліятэчнымі, але і з інфармацыйнымі ўстановамі Беларусі, якія фарміруюць асобныя віды нацыянальных дакументаў і на іх аснове генерыруюць інфармацыю (Беларускім дзяржаўным інстытутам стандартызацыі і сертыфікацыі (БелДІСС), Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі (НЦПІ) і інш.); аператыўнасць падрыхтоўкі друкаваных выданняў; паступовае зніжэнне тыража выпуску крыніц дзяржаўнай бібліяграфіі (у 2005 г. аб'яднаны выпуск "Летапісу друку Беларусі" выходзіў тыражом 170 экзэмпляраў, астатнія летапісы яшчэ меншымі тыражамі), што выклікае пытанні аб рэнтабельнасці іх выпуску, запатрабавальнасці іх з боку бібліятэк, маркетынгавай і рэкламна-інфармацыйнай дзейнасці самой НКП.

Сярод універсальных крыніц бібліяграфічнай інфармацыі, якія выходзілі ў нашай краіне за аналізуемы перыяд, таксама выдзяляюцца паказальнікі, якія адлюстроўвалі асобныя віды нарматыўна-тэхнічнай дакументацыі. Так, БелДІСС працягваў выданне бягучых інфармацыйных паказальнікаў нарматыўных прававых актаў у галіне стандартызацыі "Стандарты" (34 (2001 г.), 78 (2002 г.), 84 (2003 г.), 92 (2004 г.)), з 2005 г. змяніў назву на "Техническое нормирование и стандартизация. Информационный указатель технических нормативных правовых актов" (139, (2005 г., ч. 1)) (адзін раз у месяц); "Технические условия" (2668 (2001 г.), 2983 (2002 г.), 3302 (2003 г.), 3754 (2004 г.), 138 (2005 г., ч. 1)) (адзін раз у два месяцы)"; "Бюллетень новых поступлений" в Национальный фонд стандартов (76 (2002 г.), 78 (2003 г.), 90 (2004 г.), 136 (2005 г., ч. 1)) (штомесячна). Акрамя бягучых

інфармацыйных паказальнікаў БелДІСС выпускаў таксама універсальныя шматтомныя каталогі па адлюстраванню гэтага віда дакументаў на пачатак бягучага года "Каталог нормативных документов по стандартизации" (32 (2001 г.), 79, 80, 81, 82 (2003 г.)); з 2004 г. пачаў выдавацца паказальнік "Отмененные и замененные технические нормативные правовые акты в области стандартизации по состоянию на 1 января .... г." (91 (2004 г.)), з 2005 г. змяніў назву на "Техническое нормирование и стандартизация. Указатель отмененных и замененных технических нормативных правовых актов" (140 (2005 г., ч. 1)). Больш за 20 гадоў працягваецца выданне Беларускім інстытутам сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы (БелІСА) інфармацыйных выданняў "Бюллетень регистрации НИР, ОКР, ОТР" (2665 (2001 г.), 3299 (2003 г.), 3748 (2004 г.), 2769 (2005 г., ч. 1)), "Реферативный сборник непубликуемых работ. Отчёты НИР, ОКР, ОТР, депонированные научные рукописи" (2667 (2001 г.), 2982 (2002 г.), 3301 (2003 г.), 3752 (2004 г.), 2770 (2005 г., ч. 1)). Характарыстыка гэтых выданняў прыводзіцца ў аглядзе, прысвечаным бібліяграфічным дапаможнікам па тэхніцы. Між тым, нельга не адзначыць, што гэтыя выданні, спецыялізаваныя на адлюстраванні асобных відаў выданняў і непублікуемых дакументаў, адносяцца да крыніц агульнай бібліяграфіі і па змесце адлюстроўваемых дакументаў маюць універсальны характар, хаця ў "Паказальніку бібліяграфічных дапаможнікаў" гэтыя выданні адлюстраваны ў раздзелах "Стандартызацыя і стандарты", "Інжэнерная справа. Тэхніка ў цэлым", а спасылкі на іх у раздзеле "Універсальныя бібліяграфічныя дапаможнікі" адсутнічаюць.

З развіццём інфармацыйных тэхналогій і з'яўленнем такога віда дакументаў, як электронныя рэсурсы, перад грамадскасцю паўстала пытанне аб іх уліку не проста як інфармацыйнага фактара, а як часткі нацыянальнага набытку краіны – памяці нацыі. У нашай краіне такі ўлік пачаў ажыццяўляцца. Выходзіць такі універсальны каталог як "Информационные ресурсы Беларуси" (2 (2005 г., ч. 1)), які сёння рыхтуе Інстытут прыкладных праграмных сістэм Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і ўжо выдадзены тры выпускі гэтага каталога.

У 2002 г. выйшаў першы выпуск штогадовага універсальнага каталога "Информационные ресурсы Беларуси", які ўключаў звесткі аб інфармацыйных рэсурсах, што прайшлі дзяржаўную рэгістрацыю ў 2001–2002 гг. і ўключаны ў Дзяржаўны рэгістр інфармацыйных рэсурсаў (ІР) Рэспублікі Беларусь. Структура каталога складаецца з дзвух раздзелаў. Першы – сістэматычны паказальнік інфармацыйных рэсурсаў, у якім прыводзяцца апісанні рэсурсаў, згрупаваныя ў сістэматычным парадку ў адпаведнасці з Дзяржаўным рубрыкатарам навукова-тэхнічнай інфармацыі Расійскай Федэрацыі. Бібліяграфічны запіс уключае назву ІР скарочаную і поўную; нумар і дату дзяржаўнай рэгістрацыі; даведачную анатацыю, у якой, як правіла, указваецца тып БД, структура, аб'ект адлюстравання і змест рэсурса (хаця трэба адзначыць, што аднолькавага падыходу да структуры анатацыі няма); аб'ём БД; звесткі аб уладальніку ІР. Другі раздзел каталога – "Указатель владельцев информационных ресурсов" змяшчае ў алфавітным парадку звесткі аб уладальніках (распрацоўшчыках) БД: скарочаную і поўную назву ўстановы або прозвішча індывідуальнага ўладальніка, адрас і кантактныя тэлефоны, рэгістрацыйны нумар ІР і яго поўную назву.

Цікавасць уяўляе яшчэ адно выданне, якое адлюстроўвае электронныя рэсурсы і выдаецца з 1992 г. Фондам праграмных сродкаў БДУ – "Каталог фонда программных средств" (3287 (2001 г.), 43 (2002 г.)). Фонд працуе на базе вядучага ВНУ краіны і з'яўляецца фондатрымальнікам адукацыйных праграмных сродкаў

як беларускіх, так і расійскіх распрацоўшчыкаў. У разглядаемым выданні адлюстраваны праграмныя прадукты, педагагічныя праграмныя комплексы, электронныя даведнікі, падручнікі, іншыя выданні на CD-ROM, якія можна выкарыстоўваць не толькі з мэтай укаранення інфармацыйных тэхналогій ва ўстановы давузаўскай падрыхтоўкі і сферу вышэйшай адукацыі, але і набываць у бібліятэкі розных тыпаў, інфармацыйныя ўстановы. Каталог рыхтуецца не спецыялістамі ў бібліятэчна-бібліяграфічнай сферы, што адбіваецца і на яго метадычных асаблівасцях, звязаных з бібліяграфічнай характарыстыкай электронных рэсурсаў, распрацаванасцю даведачна-пошукавага апарата, адпаведнасцю бібліяграфічным стандартам і г. д. Між тым, не звярнуць на яго ўвагу нельга ў сувязі з унікальнасцю прадстаўляемай інфармацыі, разгорнутасцю выкладзенай у анатацыі характарыстыкі інфармацыйнага рэсурса, рэгулярнасцю (штогадовае выданне) і стабільнасцю выхаду (падрыхтавана 10 выпускаў каталога), яго карыснасцю для розных катэгорый калектыўных спажыўцоў.

Сярод крыніц бягучай бібліятэчнай бібліяграфіі універсальнага зместу асобае месца належыць каталогам, бюлетэням і спісам новых паступленняў, якія арыентуюць карыстальнікаў у фондах бібліятэк. На сённяшні дзень практычна ўсе тыпы бібліятэк – універсальныя навуковыя, бібліятэкі ВНУ, цэнтральныя бібліятэкі ЦБС – рыхтуюць такія выданні, але не ўсе бібліятэкі дасылаюць іх па абавязковаму экзэмпляру ў НКП, тыражы гэтых бюлетэняў таксама бываюць абмежаванымі невялікай колькасцю экзэмпляраў, выдаюцца сродкамі малой паліграфіі або раздрукоўваюцца на прынтары, асобныя бібліятэкі пачалі іх прадстаўляць у электроннай форме, і як вынік такога становішча, у крыніцах бібліяграфіі другой ступені, і ў тым ліку "Паказальніку бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі" адлюстравана іх невялікая колькасць. Сярод такіх выданняў: штоквартальны паказальнік "Новые книги", рыхтуемы бібліятэкай Мінскага медыцынскага інстытута (2134 (2001 г.)); "Новые книги и журналы", паступіўшыя ў бібліятэку Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта (6 (2002 г.), 9 (2003 г.), 7 (2004 г.), 9 (2005 г., ч. 1)); працягваецца выданне штоквартальнага бюлетэня Мінскай абласной бібліятэкай імя А. С. Пушкіна "Новыя паступленні даведачных, метадычных і бібліяграфічных выданняў" (9 (2001–2002 гг.), 11 (2003–2004 гг.), 12 (2005 г., ч. 1)). Аб'ектам бібліяграфавання ў гэтых крыніцах, па сутнасці, могуць выступаць усе віды дакументаў, якія набываюцца бібліятэкамі ў свае фонды: кнігі, перыядычныя выданні, аўдыявізуальныя матэрыялы, нарматыўна-тэхнічныя дакументы, электронныя рэсурсы і інш., у тым ліку і замежныя. Больш за 30 гадоў у краіне выходзілі дапаможнікі, якія мелі зводны характар і адлюстроўвалі новыя паступленні замежных выданняў у фонды бібліятэк. З 1956 года Нацыянальнага бібліятэка Беларусі выдавала штогод "Зводны паказальнік замежных перыядычных выданняў, выпісаных бібліятэкамі Рэспублікі Беларусь" (8 (2001 г.)), апошні выпуск гэтага паказальніка адлюстраваў падпіску бібліятэк на 2000 год. У цяперашні час гэты матэрыял прадстаўлены ў выглядзе электроннага рэсурса: НББ генерыруе базу даных "Зводны рэтраспектыўны каталог замежных перыядычных выданняў і выданняў з працягам", якая змяшчае бібліяграфічныя апісанні выданняў, што захоўваюцца ў фондах бібліятэк Беларусі з XVI стагоддзя, аб'ём гэтай базы даных – больш за 13 тысяч запісаў, фонды бібліятэк адлюстраваны да 1998 года. Таксама перапынілася выданне "Зводнага каталога новых замежных кніг, якія паступілі ў бібліятэкі Рэспублікі Беларусь" (7 (2001 г.), 8 (2002 г.), 10 (2004 г.), 11 (2005 г., ч. 1)), які рыхтаваўся Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі з 1969 года і выпускаўся ў выглядзе штоквартальнага паказальніка. Апошнія выданні гэтай

крыніцы адлюстравалі матэрыялы за 1999 год. Застаецца спадзявацца, што інфармацыя аб гэтых крыніцах будзе адлюстроўвацца ў ствараемым у краіне зводным электронным каталогу.

Не страчвае сваёй каштоўнасці і такая крыніца універсальнага зместу як бягучы рэкамендацыйны бюлетэнь "Новыя кнігі: па старонках беларускага друку" (5 (2001–2002 гг.), 8 (2003 г.), 6 (2004 г.), 7 (2005 г., ч. 1)), які працягвае выдаваць штомесячна з 1960 года Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Бюлетэнь інфармуе аб кнігах беларускіх выдавецтваў (у тым ліку недзяржаўных), што паступілі ў НББ, дапамагае сачыць за найбольш значнымі артыкуламі з рэспубліканскіх часопісаў і газет-штотыднёвікаў. Гэта інфармацыя прадстаўлена ў пастаянным раздзеле "Навінкі беларускага друку". З 2003 года групоўка матэрыялаў у падраздзелах ("Што чытаць пра Беларусь", "У дапамогу прафесійнаму чытанню", "У дапамогу абітурыентам", "Папулярная літаратура і літаратура для самаадукацыі", "Мастацкая літаратура", "Кнігі і публікацыі – дзецям") гэтага раздзела ажыццяўляецца згодна "Библиотечно-библиографической классификации: рабочие таблицы для массовых библиотек", што робіць яшчэ больш прывабным выкарыстанне гэтай крыніцы ў практыцы работы публічных бібліятэк для вядзення картатэк, арганізацыі выстаў, падрыхтоўкі аглядаў, розных мерапрыемстваў і г. д. Гэтаму таксама садзейнічаюць і такія метадычныя асаблівасці паказальніка як наяўнасць даведачных анатацый на неінфарматыўныя загалоўкі, прывядзенне біяграфічных звестак аб асобах, калі імя асобы ўпершыню сустракаецца на старонках бюлетэня бягучага года, наяўнасць дапаможных паказальнікаў (персанальнага, прадметнага і геаграфічнага), рэцэнзій на выданні, якія ўключаны ў бюлетэнь (раздзел "У полі зроку рэцэнзента").

Кожны нумар выдання мае дадатак. Чатыры дадаткі знаёмяць з матэрыяламі да найбольш значных дат беларускага календара і за год друкуецца каля 40 артыкулаў, прысвечаных відным дзеячам беларускай культуры, навукі, знамянальным падзеям у грамадскім, культурным, навуковым жыцці краіны, якія складаюцца з біяграфічнай ці гістарычнай даведкі і спіса літаратуры, прысвечаных разглядаемай асобе ці падзеі. Астатнія – значныя па меры бібліяграфічныя спісы, якія можна выкарыстоўваць як самастойныя бібліяграфічныя дапаможнікі (за пяць гадоў іх было падрыхтавана 30 назваў), сярод якіх і спісы універсальнага характару, напрыклад, "За страницами школьного учебника: белорусские издательства – детям" (1780 (2003 г.)), які прадставіў інфармацыю аб навукова-папулярнай, даведачнай літаратуры за 1991–2002 гг. і інш.

За разглядаемы перыяд актывізавалася работа бібліятэк па падрыхтоўцы такой крыніцы як календары знамянальных і памятных дат. Сёння гэты від рэкамендацыйнай (папулярнай) бібліяграфіі рыхтуе не толькі НББ, якая, акрамя ўжо названага беларускага календара, з 1994 года асобна выпускае "Знамянальныя і памятныя даты сусветнага календара" (44 (2001 г.), 85 (2002 г.), 91 (2003 г.), 100 (2004 г.)), а і навуковыя спецыяльныя бібліятэкі, універсальныя абласныя навуковыя бібліятэкі. Так, акрамя календароў краязнаўчага характару, Магілёўская АУНБ падрыхтавала і ўніверсальную крыніцу "Международные и всемирные праздники. Календарь дат и событий, 2002" (1979 (2003 г.)), Мінская АУНБ – "Знамянальныя і памятныя даты 2002 года: матэрыялы для работнікаў бібліятэк" (116 (2002 г.)). Каштоўнасць і папулярнасць гэтых дапаможнікаў абумоўлены спалучэннем у іх бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыі, насычанасцю даведачнымі звесткамі, імкненнем складальнікаў адлюстраваць невядомыя да нядаўняга часу старонкі мясцовай і сусветнай гісторыі і культуры, адлюстраваннем лепшай літаратуры аб рэгіёне, галіне ведаў, камплексіраваць разнастайныя матэрыялы, у тым ліку і невядомыя

архіўныя. Структура такіх календароў тыповая. Адкрываецца, як правіла, календар прадмовай, дзе даецца яго метадычная характарыстыка і прыводзяцца рэкамендацыі па выкарыстанню. Пасля прадмовы размячшаецца пералік усіх памятных дат года з адсылкай да старонак, дзе асобныя падзеі характарызуюцца больш падрабязна. Затым ідзе асноўная частка, у якой прыводзяцца тэкставыя даведкі аб кожнай памятнай даце (па месяцах і днях), а таксама фактаграфічныя, статыстычныя, бібліяграфічныя і іншыя матэрыялы. Пры адсутнасці звестак аб дні ці месяцы той ці іншай падзеі інфармацыя аб ёй змячшаецца ў канцы месяца ці года. Кожная "старонка" асноўнай часткі календара змяшчае дакладныя звесткі аб памятнай падзеі, а таксама максімальна дакладнае і інфарматыўнае яе найменне. Значэнне падзеі, яе асаблівасці раскрываюцца ў тэкставай даведцы, для напісання якой далучаюцца не толькі бібліёграфы, але і навуковыя супрацоўнікі, журналісты, настаўнікі. Завяршаецца "старонка" рэкамендацыйным спісам літаратуры – 5–10 назваў з ліку самых новых і папулярных. Акрамя таго, выкарыстоўваюцца і прыводзяцца звесткі і аб іншых матэрыялах: ілюстрацыях, звесткі з архіваў і музейных калекцый, аудыё- і відыёдакументы, статыстычныя даныя. Завяршаецца календар дапаможнымі паказальнікамі, як правіла, імянным і геаграфічным, якія дазваляюць пашырыць яго даведачныя магчымасці. Разглядаемыя календары рыхтуюцца сёння і ў аўтаматызаваным рэжыме на падставе фактаграфічнай БД аб памятных датах. Прыкладам такой БД з'яўляецца генерыруемая НББ БД "Беларусь у асобах і падзеях", дзе адлюстроўваюцца звесткі аб асобах, якія маюць дачыненне да Беларусі прафесійнай дзейнасцю, месцам нараджэння, якія жылі і ўнеслі свой уклад у яе гісторыю, навуку, культуру; звесткі аб падзеях, якія ўвайшлі ў гісторыю Беларусі; звесткі аб арганізацыях, установах, прадпрыемствах Беларусі. Аўтаматызаваны рэжым дазваляе выпускаць на іх аснове календары, прысвечаныя пэўнай тэме, мясцовасці, канкрэтнай асобе.

Яшчэ адна крыніца рэкамендацыйнага характару універсальнага зместу, падрыхтаваная супрацоўнікамі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў 2002 годзе, варта ўвагі і шырокага выкарыстання – "Кніжнае ядро дзіцячай бібліятэкі: Прыкладная бібліяграфічная мадэль" (117 (2002 г.)). Гэта выданне – своеасаблівы тып бібліяграфічнай крыніцы. Бібліяграфічныя мадэлі – важны сродак фарміравання ядра фонда бібліятэк. Не гледзячы на тое, што яны даволі ўстойлівыя ў часе, распрацоўка мадэляў ядра фонда – працэс пастаянны для пэўных тыпаў бібліятэк, і стварэннем іх пастаянна займаюцца ў розных краінах бібліяграфічныя цэнтры, асацыяцыі, буйныя бібліятэкі. Актуальнасць распрацоўкі бібліяграфічнай мадэлі фонду літаратуры для дзяцей абумоўлена зменамі ў кніжным гандлі і кнігавыданні, недасканаласцю сістэмы інфармавання аб кніжнай прадукцыі, нязначнай колькасцю рэцэнзій на дзіцячую літаратуру, уключэннем у кола чытання дзяцей раней "забытых" аўтараў і твораў. Акрамя таго, ядро надае фонду неабходную цэласнасць, завершанасць, што дазваляе паўнацэнна рэалізоўваць яго педагагічную і асветную функцыі. У аналізуемым паказальніку прадстаўлены лепшыя творы мастацкай літаратуры, навукова-пазнавальнай, даведачнай літаратуры, адбор якіх ажыццяўляўся на падставе дакладна вызначаных якасных крытэрыяў, сярод якіх: мастацкая вартасць; эстэтыка-педагагічная каштоўнасць твора; адзнака міжнароднымі і айчыннымі літаратурнымі прэміямі; выхад кнігі ў аўтарытэтных серыях; шматразовае перавыданне кнігі як сведчанне трывалай чытацкай цікавасці і інш. У выніку адбору ў паказальнік уключана 661 назва выдадзеных у 1988–1998 гг. твораў на беларускай, рускай і замежных мовах. Маецца даведачна-метадычны апарат, які прадстаўлены прадмовай і дапаможнымі паказальнікамі (імянны, назваў, серый). "Кніжнае ядро дзіцячай бібліятэкі" – гэта бібліяграфічная крыніца,

якая дапаможа бібліятэкарам, выдаўцам, настаўнікам, бацькам арыентавацца ў лепшых творах дзіцячай літаратуры, стымуляваць чытачоў малодшага, сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту да пашырэння іх кругагляду, самаразвіцця, самастойнага набыцця ведаў.

У 2001–2005 гг. працягвалася работа ў сферы рэтраспектыўнага бібліяграфавання. Значнай падзеяй стала выданне Нацыянальнай кніжнай палатай у 2003 г. бібліяграфічнага паказальніка "Газеты Беларусі. 1776–1975" (182 (2004 г.)) (складальнікі: Л. М. Няхайчык, Ю. А. Ерашэвіч, В. Я. Бакуновіч), які папоўніў скарбніцу крыніц агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі Беларусі і па сваёй мэтавай накіраванасці, метадычным рашэнням, афармленню ўяўляе ўзор фундаментальнай бібліяграфічнай працы. Названы паказальнік прадстаўляе сапраўдны рэпертуар перыёдыкі, у якім беларускія газеты прадстаўлены найбольш поўна без усялякіх абмежаванняў па аспектах палітыка-ідэалагічнага характару, што было характэрным для папярэдніх рэтраспектыўных паказальнікаў падобнага тыпу ("Газеты Беларускай ССР, 1917–1975" у 2-х частках (Мінск, 1984–1985); "Падпольныя перыядычныя выданні на Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны" (Мінск, 1975)). Паказальнік "Газеты Беларусі. 1776–1975" змяшчае інфармацыю аб 2010 беларускіх газетах за перыяд з моманту выхада першай газеты на тэрыторыі сучаснай Беларусі ("Gazeta Grodzieńska", май 1776 г.) да 1975 года ўключна. У паказальніку вытрыманы тэрытарыяльныя і храналагічныя межы адносна Беларусі. Паказальнік змяшчае газеты на беларускай мове, а таксама газеты на іншых мовах (рускай, літоўскай, нямецкай, польскай, яўрэйскай), выдадзеныя на тэрыторыі сучаснай Беларусі ці за яе межамі, калі яны мелі ў выхадных звестках прыналежнасць органа выдання да Беларусі. Значная частка газет прагледжана de visu. Інфармацыя да зводнага апісання адной газеты збіралася па крупінках у розных бібліяграфічных установах. Асноўнай базай для складання паказальніка паслужылі фонды і каталогі Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі, Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі, музея Вялікай Айчыннай вайны і інш. Частка інфармацыі па дарэвалюцыйнай перыёдыцы была атрымана з дзяржаўных абласных архіваў Рэспублікі Беларусь. Структура паказальніка складаецца з трох раздзелаў: газеты на беларускай і рускай мовах; газеты на замежных мовах; аднадзённыя газеты. Дапамагае ў аператыўным пошуку неабходных звестак цэлы набор дапаможных паказальнікаў: імянны, алфавітны паказальнік назваў газет, месцаў выданняў, храналагічны, выдаючых калектываў (арганізацый і ўстаноў), моў (акрамя беларускай і рускай) газет і тэкстаў газетных публікацый.

Да ўнікальных крыніц агульнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі, выдадзеных за гэты перыяд, трэба аднесці "Каталог выданняў XV–XVI стагоддзяў: З фондаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея" (241 (2004 г.)). Каталог з'яўляецца першым навуковым апісаннем 23-тысячнага кнігазбору музея, яго старэйшай і каштоўнейшай часткі: інкунабулаў, палеатыпаў і выданняў 2-й паловы XVI стагоддзя. У каталогу прыводзяцца звесткі аб 99 назвах указанага віду выданняў на лацінскай, польскай і нямецкай мовах, якія размешчаны ў алфавітным парадку прозвішчаў аўтараў (складальнікаў) ці загалоўкаў твораў. Выданне падаецца на мове арыгінала. Бібліяграфічныя запісы складзены ў адпаведнасці з "Правилами составления библиографического описания старопечатных изданий" (Москва, 1989) і прадстаўлены поўна, падрабязна, прыводзяцца звесткі з тытульнага аркушу, акрамя таго ўказваюцца характар набору тэксту, характарыстыка аб'ёму, зместу, даюцца ўяўленні аб застаўках, канцоўках, пераплёце, мове тэксту, штам-

пах, надпісах, экслібрысах і іншых уладальніцкіх адзнаках. Выданне мае багаты пошукавы апарат, у тым ліку і арыгінальныя дапаможныя паказальнікі, сярод якіх: імянны; друкароў і выдаўцоў; уладальнікаў кніг; паказальнік уладальніцкіх надпісаў. Даны каталог дапаўняе адпаведны раздзел ранейшага фундаментальнага выдання "Кніга Беларусі. Зводны каталог. 1517–1917". Аднолькавасць падыходаў, метадычных рашэнняў у гэтых крыніцах забяспечана таксама ўдзелам у іх падрыхтоўцы ў складзе навуковых рэдактараў знакамітых вучоных-гісторыкаў – дактароў гістарычных навук Г. Я. Галенчанкі і А. Ф. Смалянчука.

Нельга не адзначыць яшчэ адну бібліяграфічную крыніцу рэтраспектыўнага характару, якая выйшла не самастойным выданнем, а надрукавана ў выглядзе ўнутрыкніжнага спіса "Беларускія кнігі ў час акупацыі" (34 (2002 г.)) ў манаграфіі Ю. Туронка, прысвечанай праблеме беларускай кнігавыдавецкай дзейнасці ў гады Другой сусветнай вайны. Аўтарам складзены каталог беларускіх кніг, якія з верасня 1939 г. і да канца 1944 г. выпускаліся пад кантролем нямецкіх уладаў як на акупаваных тэрыторыях (Беларусь, Літва, Латвія, Беластоцкая акруга), так і ў самой Нямеччыне. У каталогу прадстаўлена 117 кніг і брашур мастацкай літаратуры, вучэбных дапаможнікаў, рэлігійнай літаратуры, прапагандысцкіх выданняў, 80% з якіх апісаны de visu, а астатнія на падставе звестак, апублікаваных у прэсе. Акрамя бібліяграфічнага апісання ў бібліяграфічным запісу прыводзяцца звесткі аб першай інфармацыі аб выпуску кнігі ў прэсе, рэцэнзіях, месцы захавання кнігі ў бібліятэках Мінску, Варшавы, Вільнюса, Рыгі, Прагі і Лондана, а таксама ў архівах Беларусі і ў прыватных калекцыях. Каталог кніг разам з іх гістарычным аглядам, вынікамі бібліяметрычнага аналізу кніг па тэматыцы, храналогіі, геаграфіі выдання, кароткімі біяграфіямі аўтараў, складальнікаў, выдаўцоў і іншых дзеячоў выдавецкага руху, іх здымкамі, а таксама ілюстрацыямі вокладак найбольш цікавых кніг робіць гэтае выданне не толькі з'явай у бібліяграфічным асяроддзі, запаўняючай "белыя плямы" кнігавыдавецкай дзейнасці, а і значнай крыніцай пры стварэнні поўнага рэпертуара беларускага кнігавыдання, унікальнай крыніцай бібліяграфічнага пошуку для бібліятэкараў-практыкаў і навучання будучых спецыялістаў.

Вынікам таксама навуковага даследавання, толькі прысвечанага гісторыі беларускай кніжнай гравюры, стаў "Паказчык кніг магілёўскага друку" (35 (2002 г.)), які адлюстраваў рэлігійную літаратуру за 1616–1798 гг., надрукаваную ў Магілёве без абазначэння друкарні, магілёўскія выданні Спірыдона Собаля, а таксама выданні друкарні Магілёўскага Багаяўленскага брацтва – аднаго з буйнейшых цэнтраў беларускай кірыліцкай кніжнасці XVII–XVIII стагоддзяў.

Аналіз масіва бібліяграфічных крыніц за разглядаемы перыяд дазваляе канстатаваць такую станоўчую з'яву як пашырэнне кола аб'ектаў рэтраспектыўнага бібліяграфічнага ўліку за кошт адлюстравання кінадакументаў у спецыяльным выданні (заўважым, што бягучага ўліку аўдыявізуальных дакументаў у краіне не вядзецца). Выпусціў гэты бібліяграфічны даведнік "Белорусский государственный архив кинофотодокументов" (4607 (2003 г.)) (у падзагаловачных даных ён названы як проста даведнік) сумесна з Беларускім НДІ дакументазнаўства і архіўнай справы Беларускі дзяржаўны архіў кінафотадакументаў (БДАКФФД), які з'яўляецца адзіным у краіне на працягу апошніх шасцідзесяці гадоў дзяржаўным сховішчам кіна-, фота- і фонадакументаў, фонды якога маюць міжнароднае значэнне. Першая частка даведніка адлюстроўвае звесткі аб захоўваючыхся ў архіве 7809 кінадакументах 1918–1990 гг., сярод якіх дакументальныя, тэлевізійныя фільмы, кінасюжэты кіначасопісаў "Советская Белоруссия", "Новости дня" і інш. Адсутнічае інфармацыя аб мастацкіх, тэлевізійных мастацкіх і анімацыйных фільмах

у сувязі з тым, што яны сталі паступаць у БДАКФФД толькі ў 90-е гады XX ст. і іх колькасць не вельмі значная на канец вызначанага ў паказальніку ўліковага перыяду. Аб дастаткова высокім метадычным узроўні разглядаемага выдання сведчаць не толькі аб'ём прадстаўленага матэрыялу, але і змест бібліяграфічнай характарыстыкі матэрыялу, прафесійна падрыхтаваны даведачна-метадычны апарат. Кожны кінафільм прадстаўлены бібліяграфічным запісам, які ўключае назву, год выпуска, прозвішчы сцэнарыстаў, рэжысёраў, аператараў, указанне жанру, колькасці частак, наяўнасці фанаграмы, колеру, метражу, архіўнага шыфра, а таксама даведачнай анатацыі, раскрываючай тэматыку твора. Змястоўнаму раскрыццю і пошуку неабходных дакументаў садзейнічаюць таксама дэталёвая сістэматычная групоўка матэрыялаў і наяўнасць шэрагу дапаможных паказальнікаў: геаграфічных назваў (месцаў здымак); імянныя паказальнікі асоб, зафіксаваных у кінадакументах (персаналіі), сцэнарыстаў, рэжысёраў, аператараў.

Працягвалася выданне крыніц універсальнага зместу, прадстаўленае паказальнікамі прац супрацоўнікаў навуковых устаноў, вышэйшых навучальных устаноў, напрыклад: "Библиографический указатель опубликованных работ профессорско-преподавательского состава Белорусской государственной политехнической академии, 1994–1999" (1412 (2001 г.)); дапаможнікамі, якія адлюстроўваюць асобныя віды выданняў, напрыклад: "Учебники и научные труды преподавателей Белорусского государственного экономического университета, 1993–2002" (1876 (2003 г.)); біябібліяграфічнымі даведнікамі, напрыклад: "Национальная академия наук Беларуси: Персональный состав, 1928–2003" (171 (2004 г.)), "Прафесары і дактары навук Беларускага дзяржаўнага універсітэта: 1921–2001" (1579 (2002 г.)). Як правіла, гэтыя крыніцы рыхтуюцца і выходзяць у сувязі з юбілейнымі падзеямі ў дзейнасці пэўных устаноў, часта з'яўляюцца працягам раней выдаваемых крыніц пад агульнай назвай, маюць агульную методыку падрыхтоўкі, добрае паліграфічнае афармленне, аўтарытэтную рэдакцыйную камісію. Усё гэта можна аднесці і да такога універсальнага біябібліяграфічнага даведніка як "Асветнікі зямлі Беларускай: X – пачатак XX ст." (135 (2001 г.)), другое выданне якога было падрыхтавана і выпушчана ў 2001 г. выдавецтвам "Беларуская Энцыклапедыя". Ахоп прадстаўнікоў грамадска-палітычнай думкі і асветнікаў, сфера іх дзейнасці, храналагічныя межы з'яўляюцца вельмі прадстаўнічымі і ўнушальнымі. У даведніку змешчана каля 750 біяграфій дзяржаўных, грамадска-палітычных і рэлігійных дзеячоў, філосафаў і педагогаў, вучоных і вынаходнікаў, пісьменнікаў і мастакоў, кампазітараў і музыкантаў, выдаўцоў і бібліятэкараў, прыродазнаўцаў, падарожнікаў і краязнаўцаў, удзельнікаў нацыянальна-вызваленчага і рэвалюцыйнага руху, незалежна ад нацыянальнай прыналежнасці, грамадскай пазіцыі, светапогляду – усіх, хто на працягу апошняга тысячагоддзя (ад X да пачатку XX стагоддзя) сцвярджаў аўтарытэт краіны і яе народа, рабіў свой уклад у скарбонку нацыянальнай і сусветнай культуры. У метадычным плане даведнік падрыхтаваны традыцыйна: матэрыял размешчаны ў алфавітным парадку прозвішчаў асоб; прыводзіцца біяграфічны нарыс з раскрыццём жыццёвага і творчага шляху, аналізам светапогляду дзеяча, які дапаўняе бібліяграфічны спіс работ гэтага дзеяча, а таксама спіс літаратуры (пры наяўнасці) аб ім. Артыкулы пра асветнікаў, як правіла, ілюструюцца партрэтамі. Такое грунтоўнае выданне – незаменны даведнік не толькі для навукоўцаў, студэнтаў, але і для работнікаў бібліятэк у разнастайных кірунках работы.